# САЦЫЯЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА Ў АДНОСІНАХ ДА СЯМ'І І ДЗЯЦЕЙ У БЕЛАРУСІ

***В. У. ЧЭЧАТ,***
***загадчык кафедры педагогікі***
***магістратуры Нацыянальнага інстытута адукацыі,***
***доктар педагагічных навук, прафесар***

**(Заканчэнне. Пачатак у № 12 за 1997 г.)**

## IV. Формы сацыяльнай падтрымкі дзяцей і сямей

**Стварэнне сістэмы дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый па сацыяльнай абароне сям'і і дзяцінства.** У мэтах эфектыўнага функцыяніравання гэтай сістэмы створаны і здзяйсняюць канкрэтную работу з дзецьмі і сем'ямі:

1. *Нацыянальная камісія па правах дзіцяці.* Яе асноўныя задачы:

— распрацоўка праграм падтрымкі дзяцей і ўнясенне іх на разгляд Прэзідэнту і ўраду Рэспублікі Беларусь (так, у 1997 г. распрацавана праграма «Дзеці Беларусі» на 1997—2000 гады з пяццю падпраграмамі: 1) дзеці-сіроты, 2) дзеці-інваліды, 3) дзеці Чарнобыля, 4) сацыяльнае абслугоўванне сям'і і дзяцей, 5) аб развіцці індустрыі дзіцячага харчавання);

— зацвярджэнне нацыянальных дакладаў па пытаннях абароны правоў дзяцей для Камітэта ААН па правах дзіцяці;

— каардынацыя дзейнасці міністэрстваў і іншых цэнтральных органаў кіравання, органаў рэгіянальнага (мясцовага) кіравання і самакіравання, грамадскіх аб'яднанняў па выкананню заканадаўчых і іншых нарматыўных актаў адносна абароны правоў і інтарэсаў дзяцей;

— кантроль за выкананнем артыкулаў і палажэнняў Закона «Аб правах дзіцяці»;

— правядзенне рэспубліканскіх дабрачынных акцый і іншых мерапрыемстваў у падтрымку дзяцей, якія аказаліся ў экстрэмальных сітуацыях;

— шырокае інфармаванне дзяцей, бацькоў, прадстаўнікоў грамадскасці аб выкананні Канвенцыі ААН аб правах дзіцяці і



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

іншых заканадаўчых і нарматыўных актаў, вывучэнне іх у навучальных установах.

2. *Рэгіянальныя дзяржаўныя органы абароны дзяцінства.* З мэтай выканання функцый па абароне дзяцінства ў абласных, гарадскіх і раённых упраўленнях адукацыі створаны аддзелы абароны дзяцінства. У іх штаты ўведзены інспектары па абароне дзяцінства і спецыялісты для аказання юрыдычнай, сацыяльнай, дэфекталагічнай, псіхолага-педагагічнай дапамогі дзецям, сем'ям, насельніцтву.

3. *Недзяржаўныя арганізацыі.* Іх у Беларусі юрыдычна зарэгістравана больш як 700. Многія з гэтых арганізацый працуюць з сем'ямі, дзецьмі, групамі насельніцтва (ахвярамі Чарнобыля, інвалідамі, сіротамі). Сярод мноства арганізацый вылучаюцца недзяржаўныя жаночыя, маладзёжныя і дзіцячыя арганізацыі. Яны прадстаўляюць два напрамкі: 1. Жаночыя арганізацыі — усяго 11 (Ліга жанчын Беларусі, Саюз жанчын Рэспублікі Беларусь, Жаночы хрысціянска-дэмакратычны рух Беларусі, Беларускі дабрачынны жаночы фонд «Вера, Надзея, Любоў», Беларускі жаночы фонд Еўфрасінні Полацкай і інш.). 2. Дзіцячыя і маладзёжныя недзяржаўныя арганізацыі — усяго 42, 10 з якіх аказваюць дапамогу і падтрымку дзецям Чарнобыля (Беларускі камітэт «Дзеці Чарнобыля», Беларускі дзіцячы фонд, Беларускі фонд сацыяльнай падтрымкі дзяцей і падлеткаў «Мы — дзецям», Міжнародная дабрачынная арганізацыя «Надзея — Экспрэс», Камітэт «SOS — дзіцячая вёска ў Рэспубліцы Беларусь», Беларуская асацыяцыя «Сямейны дзіцячы дом», Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам, Саюз моладзі Беларусі і інш.).

**Сістэма дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей.** Заканадаўствам Рэспублікі Беларусь устаноўлена, што перыяд, на працягу якога сям'і патрабуецца матэрыяльная, маральная і прававая падтрымка на ўтрыманне і выхаванне дзяцей, працягваецца да дасягнення імі 18 гадоў. Асабліва важнае значэнне мае сацыяльнае забеспячэнне жанчыны ў перыяд яе актыўнага мацярынства, які ўключае цяжарнасць, роды і догляд дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў.

Адным з механізмаў сацыяльнай абароны ў пераходны перыяд з'яўляецца палітыка пераразмеркавання расходаў на карысць тых ці іншых катэгорый сямей. Гэта палажэнне адлюстравана ў Законе «Аб дзяржаўнай дапамозе сем'ям, якія маюць дзяцей» (1992 г.), што ўступіў у сілу з 1 студзеня 1993 г.

Дзяржаўная дапамога і надбаўкі да яе назначаюцца і выплачваюцца пастаянна пражываючым на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. Замежныя грамадзяне, што маюць дзяцей, карыстаюцца ў Рэспубліцы Беларусь правам на дапамогу, калі гэта прадугледжана міжнароднымі дагаворамі ці пагадненнямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Комплекс мер па развіццю здольнасцей і дараванняў дзяцей.** У гэтым комплексе мер выдзяляюцца: 1) стварэнне і развіццё сеткі ўстаноў новага тыпу; 2) арганізацыя вольнага часу, канікул, адпачынку дзяцей і моладзі; 3) стварэнне спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па спецыяльнай падтрымцы таленавітых навучэнцаў і студэнтаў і ўстанаўленне стыпендый Прэзідэнта студэнтам дзяржаўных вышэйшых навучальных устаноў (1996 г.).

У адпаведнасці з гэтым у 1996 г. зацверджаны: «Палажэнне аб заахвочванні пераможцаў прадметных міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд, канферэнцый, конкурсаў і турніраў навучэнцаў агульнаадукацыйных навучальных устаноў», «Палажэнне аб конкурсе аспірантаў на лепшую навуковую работу», «Палажэнне аб аказанні матэрыяльнай дапамогі студэнтам і навучэнцам, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучобе», «Палажэнне аб стыпендыях Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь студэнтам дзяржаўных вышэйшых навучальных устаноў».

**Сістэма дашкольнага выхавання.** Функцыі дзіцячых дашкольных устаноў за апошнія 5 гадоў істотна змяніліся. Гэтыя ўстановы сталі больш эфектыўна забяспечваць сацыяльна-педагагічную абарону правоў і інтарэсаў дзяцей. Стыль іх работы максімальна набліжаны да сямейнага. Створаны розныя віды і тыпы дашкольных устаноў з арыентацыяй на асобу дзіцяці, яго патрэбнасці, інтарэсы, схільнасці, з улікам занятасці бацькоў (дзяржаўныя, грамадскія, прыватныя, змешаныя; дзіцячыя сады з гібкім рэжымам работы; сямейныя ці дамашнія дзіцячыя сады; сады з паглыбленым накірункам у рабоце — па выяўленчаму мастацтву, музыцы, харэаграфіі, замежнай мове; санаторныя сады для дзяцей, якія часта і працягла хварэюць, і інш.).

У мэтах больш эфектыўнага выхавання і развіцця дзяцей, згодна з Канцэпцыяй дашкольнага выхавання (1990 г.), устаноўлена аптымальная напаўняльнасць груп у дзіцячых садах (для ўзроставых груп 1—3 гадоў — 6—8 дзяцей, 3—5 гадоў — 8—10 дзяцей, 5—6 гадоў — 10—12 дзяцей). Ствараюцца 5—6-групавыя дашкольныя ўстановы з мэтай іх максімальнага набліжэння да ўмоў сям'і. Падрыхтаваны варыяцыйныя праграмы навучання і выхавання, у якія ўключаны пытанні аб правах дзяцей, абароне іх гонару і годнасці, выхаванні самапавагі, асэнсаванні самакаштоўнасці, задавальненні патрэбнасці ў прызнанні асабістай значнасці бацькамі, аднагодкамі. Ажыццяўляецца ўкараненне асобасна арыентаванай мадэлі адносін выхавальніка і дзяцей, якая па характару і стылю набліжаецца да сямейных адносін. Адбываецца гуманізацыя навучальна-выхаваўчага працэсу. Распрацоўваюцца меры па абароне дзяцей ад жорсткага абыходжання з імі ў сям'і (псіхалагічнага, фізічнага, сексуальнага насілля, ігнаравання іх патрэбнасцей і інтарэсаў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Апякунская (прыёмная) сям'я.** Яна атрымала юрыдычны статус у 1991 г. Рашэнне аб стварэнні апякунскай сям'і, у якой можа выхоўвацца ад 1 да 5 дзяцей, прымаецца раённым (гарадскім) выканаўчым камітэтам па прапанове раённага (гарадскога) органа кіравання адукацыяй. Дзеці ў гэтых сем'ях знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні да заканчэння імі навучальнай установы і працаўладкавання. На іх распаўсюджваюцца льготы, якія ўстаноўлены заканадаўствам для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без бацькоўскай апекі. Апякунскія сем'і маюць розныя матэрыяльныя і жыллёвыя ўмовы. Але іх аб'ядноўваюць гуманныя, міласэрныя, клапатлівыя адносіны да дзяцей, жаданне вырасціць іх дастойнымі грамадзянамі і падрыхтаваць да самастойнага жыцця. Палажэннем аб апякунскай сям'і прадугледжваюцца кантакты дзяцей з іх біялагічнымі бацькамі, вяртанне ў ранейшую сям'ю ў выпадку аднаўлення бацькі і маці ў бацькоўскіх правах пры ўмове, калі гэта не супярэчыць інтарэсам дзяцей.

**Дзіцячы дом сямейнага тыпу.** Такіх дамоў значна менш, чым апякунскіх сямей, таму што яны даражэй абыходзяцца дзяржаве. Акрамя штомесячнай грашовай дапамогі на кожнае дзіця, дзяржава выплачвае зарплату бацькам-выхавальнікам, забяспечвае сям'ю жыллём (звычайна выдзяляюцца дзве кватэры ці асобны катэдж), аплачвае ўсе расходы на абслугоўванне памяшканняў, а таксама паслугі сувязі, набыццё медыкаментаў, спартыўнага інвентару, музычных інструментаў і г. д.

Асноўныя задачы дзіцячых дамоў сямейнага тыпу: 1) рэалізоўваць права кожнага дзіцяці на пражыванне і выхаванне ў сям'і ў атмасферы любві і ўзаемаразумення; 2) ажыццяўляць грамадска-дзяржаўную дапамогу дзецям-сіротам і дзецям, якія засталіся без бацькоўскай апекі; 3) абараняць правы гэтых дзяцей; 4) ствараць неабходныя ўмовы для паўнацэннага развіцця, падрыхтоўкі да самастойнага жыцця і працоўнай дзейнасці.

**Дзіцячая вёска.** Гэта адзін з варыянтаў дзіцячага дома сямейнага тыпу. Такая вёска пабудавана ў г. Кобрыне Брэсцкай вобл. з дапамогай жыхароў зямлі Паўночны Рэйн — Вестфалія з Германіі. Дзіцячая вёска размяшчаецца ў маляўнічай мясцовасці на ўскраіне горада. У дзевяці двухпавярховых катэджах пражываюць 56 дзяцей розных узростаў (ад 1 да 15 гадоў) і 12 маці-выхавальніц.

**SOS-Kinderdorf.** У 1991 г. была створана грамадская арганізацыя «Беларускі камітэт «SOS — дзіцячыя вёскі». У 1992 г. пачалося будаўніцтва першай у Беларусі SOS — дзіцячай вёскі. Праект фінансаваў фонд імя Г. Гмайнера. 1 чэрвеня 1995 г. адбылося яе адкрыццё. У вёсцы ў асобных двухпавярховых катэджах пражывае 12 сельскіх сямей: маці разам з 6—8 дзецьмі (усяго 119 дзяцей розных узростаў). У перспектыве ў дзіцячай

вёсцы будзе функцыяніраваць сацыяльны цэнтр маці і дзіцяці імя Г. Гмайнера.

**Нацыянальнае і міжнароднае ўсынаўленне.** У Беларусі ўсынаўленне рэгулюецца Кодэксам аб шлюбе і сям'і і Законам «Аб правах дзіцяці». Усынаўленне магчыма толькі ў адносінах да непаўналетніх і ў іх інтарэсах. Яно афармляецца рашэннем мясцовага распарадчага і выканаўчага органа, якое рэгіструецца ў органах загса. Для ўсынаўлення дзіцяці, якое дасягнула 10-гадовага ўзросту, неабходна яго згода. Калі бацькі дзіцяці, якое ўсынаўляецца, жывыя, то для ўсынаўлення неабходна іх згода, за выключэннем тых выпадкаў, калі яны пазбаўлены бацькоўскіх правоў, прызнаны ва ўстаноўленым парадку недзеяздольнымі, прапаўшымі без вестак ці ўхіляюцца ад выхавання дзіцяці.

Пры ажыццяўленні міжнароднага ўсынаўлення важнейшымі патрабаваннямі і ўмовамі з'яўляюцца: 1) немагчымасць усынаўлення дзіцяці ў сваёй краіне; 2) дэталёвае вывучэнне сацыяльнага, матэрыяльнага, псіхалагічнага стану сям'і, якая хоча ўсынавіць дзіця; 3) устанаўленне факта, што ўсынаўленне канкрэтнай сям'ёй найлепшым чынам адпавядае інтарэсам дзіцяці; 4) суаднясенне заканадаўства Беларусі з заканадаўствам краіны пражывання ўсынавіцеляў з мэтай выяўлення, ці забяспечвае яно абарону інтарэсаў дзяцей у выпадку ўсынаўлення; 5) прадастаўленне органамі краіны, у якой пражывае ўсынавіцель, рэгулярнай інфармацыі аб працэсе адаптацыі дзіцяці ў прыёмнай сям'і; 6) рашэнне працэдурных пытанняў усынаўлення ажыццяўляецца цэнтральнымі кампетэнтнымі органамі абедзвюх краін у працэсе ўзаемных кантактаў, перагавораў і перапіскі; 7) дазвол краіны і яе іміграцыйнай службы на прыезд дзіцяці; 8) недапушчальнасць атрымання пэўнай матэрыяльнай ці фінансавай выгады кім-небудзь з удзельнікаў міжнароднага ўсынаўлення; 9) вырашэнне працэдуры дадатковага кантролю па абароне правоў усыноўленых дзяцей і захавання іх кантактаў з радзімай.

**Інтэграцыя ў грамадства дзяцей-інвалідаў і дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.** З улікам канцэптуальных падыходаў і існуючых у развітых краінах форм інтэграванага навучання гэтай катэгорыі дзяцей у Беларусі ў пачатку 90-х гадоў створана эксперыментальная мадэль інтэграванага навучання дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў звычайных школах і навучальных установах (раней яны навучаліся і выхоўваліся ў спецыяльных школах). Гэта мадэль уключае 6 відаў класаў і школ.

1. Класы інтэграванага навучання з напаўняльнасцю не больш за 20 вучняў. У іх можа быць не больш як 3 вучні з цяжкай паталогіяй аднароднага характару (глухіх, сляпых, разумова адсталых, з цяжкімі камбінаванымі парушэннямі) ці не больш як 6 вучняў з аднароднымі неглыбокімі парушэннямі (са слабым слыхам, зрокам, з затрымкай псіхічнага развіцця, з цяжкімі

парушэннямі мовы, апорна-рухальнага апарату аутычных дзяцей). Максімальная колькасць дзяцей з неаднароднымі парушэннямі — 2—4 (2 з цяжкай паталогіяй ці 4 з неглыбокімі парушэннямі, але не больш за два тыпы парушэнняў). Навучанне ў класе сумесна з настаўнікам ажыццяўляе дэфектолаг.

2. Спецыяльныя класы ў агульнаадукацыйнай школе з напаўняльнасцю ад 6 да 12 вучняў у залежнасці ад профілю і цяжкасці парушэнняў. Мэтазгодныя арганізацыя груп падоўжанага дня і правядзенне пазакласнай работы на інтэграванай аснове сумесна з вучнямі звычайнай агульнаадукацыйнай школы. Абавязковай умовай стварэння класаў інтэграванага і спецыяльнага навучання з'яўляецца наяўнасць у школе кваліфікаваных настаўнікаў, важнейшых псіхолага-педагагічных умоў і абсталявання, што неабходны для стварэння спрыяльнага рэжыму і арганізацыі лячэбна-карэкцыйнай работы.

3. Групы вучняў у звычайнай сельскай агульнаадукацыйнай школе, для якіх арганізуецца карэкцыйна-педагагічнае кансультаванне як спецыяльна арганізаваная форма навучання. Яго ажыццяўляе настаўнік-дэфектолаг адной са звычайных агульнаадукацыйных ці спецыяльных школ.

4. Спецыяльныя школы ў гарадах, раённых цэнтрах з невялікім кантынгентам вучняў (да 100 чалавек). Яны размяшчаюцца недалёка ад звычайнай агульнаадукацыйнай школы ці на адной з ёю пляцоўцы. У такіх школах магчыма навучанне дзяцей не толькі з аднароднымі, але і неаднароднымі парушэннямі рознай ступені складанасці.

5. Спецыяльныя школы-інтэрнаты для навучання дзяцей, якія маюць сур'ёзныя парушэнні ў разумовым і фізічным развіцці аднароднага характару. Такіх школ-інтэрнатаў можа быць некалькі. У іх дзеці змогуць вучыцца на працягу ад аднаго да некалькіх гадоў ці праходзіць пэўны карэкцыйна-рэабілітацыйны курс на працягу некалькіх месяцаў.

6. Індывідуальнае навучанне дома ўсіх без выключэння дзяцей з цяжкімі парушэннямі ў развіцці. Такое навучанне прадугледжвае кантакты хворых дзяцей з іх нармальнымі аднагодкамі.

**Сацыяльна-псіхолага-педагагічная падтрымка дзяцей, якія апынуліся ў экстрэмальных сітуацыях.** Для гэтай катэгорыі дзяцей прагназіруюцца наступныя захады.

1. Стварэнне за кошт бюджэтных і спонсарскіх сродкаў, ахвяраванняў у кожным рэгіёне (вобласці) сеткі невялікіх дзіцячых прытулкаў ці дзіцячых дамоў, у якіх дзіця ці яго сям'я пры экстрэмальнай сітуацыі змаглі б атрымаць неабходную сацыяльную і псіхолага-педагагічную падтрымку.

2. Стварэнне часовых прыёмных сямей, у якіх непрацяглы час могуць знаходзіцца дзеці, што апынуліся ў неспрыяльных жыццёвых сітуацыях.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Арганізацыя служб неадкладнай псіхолага-педагагічнай дапамогі, тэлефонаў даверу, індывідуальнага кансультавання. У канцы 1996 г. у Мінску пачала функцыяніраваць першая ў Беларусі сацыяльна-псіхалагічная служба па папярэджанню ўсіх форм насілля над дзецьмі «Дзеці — не для насілля». Юрысты, медыкі, псіхолагі, педагогі аказваюць дапамогу дзецям і падлеткам — ахвярам насілля і жорсткага абыходжання з боку бацькоў ці незнаёмых людзей. У службу звяртаюцца таксама бацькі, каб атрымаць рэкамендацыі, як уберагчы сваё дзіця ад насілля, як дапамагчы яму ў бядзе, як пазбегнуць магчымага выкрадання дзяцей і г. д.

4. Сацыяльна-псіхолага-педагагічная дапамога дзецям, якія знаходзяцца ў пастаянным кантакце з бацькамі-алкаголікамі. Такая дапамога ажыццяўляецца па методыцы, распрацаванай на факультэце сацыяльнай работы Стакгольмскага універсітэта (Швецыя) і прыстасаванай да сістэмы выхавання ў Беларусі.

5. Дэцэнтралізацыя і разбуйненне вялікіх дзяржаўных устаноў для дзяцей з асацыяльнымі паводзінамі, у якіх максімальная колькасць выхаванцаў не павінна перавышаць 50 чалавек.

6. Сацыяльная і медыка-псіхолага-педагагічная дапамога дзецям і сем'ям, якія пражываюць на забруджаных радыенуклідамі тэрыторыях у выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Гэта дапамога аказваецца ў самых розных формах: перасяленне сямей на экалагічна больш чыстыя тэрыторыі, аздараўленне дзяцей у краінах бліжняга і далёкага замежжа, гуманітарная дапамога дзецям і сем'ям, стварэнне аздараўленча-адукацыйных цэнтраў, цэнтраў сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі і інш.

Напрыклад, на тэрыторыі Беларусі па праграме «ЮНЕСКА — Чарнобыль» адкрыты тры цэнтры сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі ў Аксакаўшчыне, Стрэшыне, Пяршаі.

Стварэнне цэнтраў сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі было абумоўлена праблемамі, якія паўсталі перад нашым грамадствам. Сярод іх: бядотнае становішча сямей у выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС; раз'яднанне бацькоў і дзяцей у выніку адсялення; раз'яднанасць калектываў і груп людзей; з'яўленне пачуцця страху, трывожнасці, няўпэўненасці; страта работы; пагаршэнне маральнага і псіхафізічнага здароўя.

*Мэты і задачы цэнтраў:*

— умацоўваць сямейныя сувязі;

— выпрацоўваць культуру бацькоўскага выхавання (уменні і навыкі);

— павышаць маральна-псіхалагічны стан бацькоў і дзяцей, усіх сацыяльных груп насельніцтва;

— заахвочваць людзей да самавыяўлення і самастойнасці;

— развіваць пачуццё даверу і сацыяльнай адказнасці;

— садзейнічаць развіццю раёна пражывання праз рэалізацыю мясцовых ініцыятыў і праграм.

*Прынцыпы, метады і сродкі работы цэнтраў:* індывідуальная і сямейная тэрапія; работа з групамі рызыкі; устанаўленне адносін унутры калектыву; наладжванне адносін з мясцовымі арганізацыямі, суседнімі калектывамі і ўстановамі; ажыццяўленне пастаяннага кантролю і павышэнне прафесіяналізму персаналу; рэгулярнае правядзенне ацэнкі дзейнасці цэнтраў; ажыццяўленне прафесіянальнай каардынацыі на нацыянальным узроўні.

У *праграму дзейнасці цэнтраў* уваходзяць:

1. Адукацыйная работа, мастацкая творчасць і заняткі спортам (навуковая дзейнасць, выкладанне замежных моў, абучэнне рамёствам, заняткі спортам, музыкай, выяўленчым мастацтвам, лепкай, камп'ютэрная грамата).

2. Рэабілітацыйная работа з дзецьмі і сем'ямі (гульнявая дзейнасць, работа з групамі падтрымкі, індывідуальныя, групавыя і сямейныя кансультацыі).

3. Грамадская дзейнасць (работа клубаў для пажылых людзей, арганізацыя муніцыпальных сустрэч, правядзенне свят, экскурсій, паходаў, паездак).

4. Інфармацыйная дзейнасць (інфармаванне насельніцтва, выдавецкая дзейнасць, эканамічная дзейнасць).

**Міжнародныя і рэспубліканскія акцыі, канферэнцыі, семінары, тэлеперадачы, конкурсы.** Яны праводзяцца рэгулярна і закранаюць розныя аспекты абароны дзяцінства і сям'і ў Беларусі.

## V. Пазітыўныя перамены і нявырашаныя праблемы

Вывучэнне стану сацыяльнай абароны сям'і і дзяцінства ў Беларусі ў апошнія 10 гадоў сведчыць як аб пазітыўных переменах, так і аб нявырашаных праблемах.

Да пазітыўных перамен варта аднесці наступнае:

1. У пачатку 90-х гадоў зроблена першая спроба аб'ектыўнага аналізу становішча розных катэгорый дзяцей у Беларусі, вызначэння сродкаў і ўмоў, неабходных для выжывання і развіцця дзіцячага насельніцтва. Канкрэтныя даныя гэтага аналізу прадстаўлены ў брашуры Беларускага дзіцячага фонду «Аб становішчы дзяцей у Рэспубліцы Беларусь» (1992 г.); Перыядычным дакладзе Рэспублікі Беларусь аб ажыццяўленні палажэнняў Канвенцыі аб правах дзіцяці (1993 г.), які прадстаўлены ў Камітэт па правах дзіцяці ААН; аналітычнай запісцы Міністэрства адукацыі аб агульным становішчы дзяцей у Беларусі (1995 г.); Нацыянальным дакладзе «Дзеці і жанчыны ў Беларусі: сёння і заўтра» (1995 г.), падрыхтаваным па сумеснай ініцыятыве ЮНІСЕФ і ўрада Рэспублікі Беларусь.

2. Урад Беларусі ратыфікаваў Канвенцыю аб правах дзіцяці (1990 г.) і паставіў свой подпіс пад Дэкларацыяй выжывання, развіцця і абароны дзіцяці. У 1993 г. прыняты Закон Рэспублікі

Беларусь «Аб правах дзіцяці», а ў 1995 г. — Нацыянальны план дзеянняў па абароне правоў дзяцей на 1995—2000 гг.

3. У кожным рэгіёне (вобласці) краіны пачаўся працэс фарміравання сістэмы работы ўсіх галін улады, дзяржаўных і недзяржаўных арганізацый па сацыяльнай абароне сям'і і дзяцей, намечаны комплекс арганізацыйных, метадычных і практычных мерапрыемстваў па выкананню Закона «Аб правах дзіцяці» і Нацыянальнага плана дзеянняў па абароне правоў дзяцей на 1995—2000 гг.

4. Пачаўся працэс стварэння нацыянальнага механізму абароны сям'і і дзяцінства. Яго функцыяніраванне ідзе па чатырох узаемазвязаных напрамках. Першы напрамак — палітычны (распрацоўка і ажыццяўленне дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да дзяцей як асобай сацыяльна-дэмаграфічнай катэгорыі грамадства са спецыфічнымі патрэбнасцямі і інтарэсамі; палітыкі, якая ўключае ідэалагічныя, экалагічныя, юрыдычныя, дэмаграфічныя меры, абапіраецца на нацыянальную культуру, традыцыі, устоі). Другі напрамак — заканадаўчы (прывядзенне ў адпаведнасць з Канвенцыяй аб правах дзіцяці і Законам Рэспублікі Беларусь «Аб правах дзіцяці» зместу ўсіх законаў, якія распрацоўваюцца і прымаюцца ў Беларусі, рэгіянальных і мясцовых нарматыўных актаў, інструкцый і палажэнняў). Трэці напрамак — праграмны (распрацоўка, прыняцце і рэалізацыя спецыяльных праграм, накіраваных на паляпшэнне становішча сямей і ўсіх катэгорый дзяцей). Чацвёрты напрамак — кіраўніцкі (стварэнне і функцыяніраванне на ўсіх узроўнях спецыяльных дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый, фондаў і аб'яднанняў, якія непасрэдна займаюцца праблемамі сацыяльнай абароны сям'і, бацькоўства, мацярынства і дзяцінства).

5. Праведзена работа па азнаямленню дзяцей, бацькоў, прадстаўнікоў грамадскасці з Канвенцыяй аб правах дзіцяці і Законам Рэспублікі Беларусь «Аб правах дзіцяці». У большасці навучальных устаноў сістэмы адукацыі ўведзены спецыяльны курс «Правы дзіцяці».

6. Упершыню ў Беларусі пачаўся працэс інтэграцыі ў грамадства дзяцей-інвалідаў і дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Створана эксперыментальная мадэль інтэграванага навучання дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў звычайных школах і навучальных установах.

**Нявырашаныя праблемы.**

Пакуль што не ўдаецца спыніць працэс росту колькасці сацыяльных сірот і дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага і фізічнага развіцця.

Не створаны неабходныя ўмовы для навучання ўсіх дзяцей-інвалідаў і дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, у прыватнасці не хапае спецыяльных рэабілітацыйна-дыягнастычных устаноў, у якіх можна было б ставіць дыягназ і вызна-

чаць узрост для навучання гэтай катэгорыі дзяцей; марудна ўкараняецца сістэма інтэграванага навучання дзяцей-інвалідаў у агульнаадукацыйных школах.

Не рэалізуецца ў поўнай меры права выбару дзецьмі і іх бацькамі, якія жывуць у сельскай мясцовасці, тыпу навучальнай установы ў адпаведнасці з інтарэсамі і схільнасцямі дзяцей і жаданнем бацькоў.

У падручніках недастаткова поўна адлюстраваны палажэнні і ідэі Канвенцыі аб правах дзіцяці, Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека.

Вельмі мала выдаецца навукова-папулярнай і метадычнай літаратуры, якая спрыяла б пашырэнню і паглыбленню ведаў дзяцей і бацькоў аб міжнародных прававых актах і дакументах аб правах дзяцей, дапамагала б бацькам і дзецям у самаадукацыі, ва ўмацаванні свайго псіхафізічнага, маральна-псіхалагічнага і духоўнага здароўя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ